Усходнеславянскі навуковы гурток
Інстытута ўсходнеславянскай філалогіі
Універсітэта імя Адама Міцкевіча ў Познані
мае гонар запрасіць вас прыняць удзел у

I Міжнароднай студэнцка-аспіранцкай канферэнцыі з цыкла
*Усходнеславянскія мовы, культуры і літаратуры ў даследаваннях маладых вучоных*,
якая адбудзецца **11 красавіка 2025 года**
пад эгідай дырэктара Інстытута ўсходнеславянскай філалогіі
доктара гуманітарных навук, прафесара УАМ Ваўжынца Попель-Махніцкага.

Асноўная тэма:
*"Слова" ва ўсходнеславянскіх мовах, літаратурах і культурах*.

Мэта канферэнцыі – даследаваць значэнне і ролю слова ў разнастайных літаратурных і лінгвістычных кантэкстах, у тым ліку яго эстэтычныя, культурныя, семантычныя і прагматычныя функцыі.

Прапанаваныя панэльныя дыскусіі будуць сканцэнтраваны на наступных пытаннях:

- слова як носьбіт мастацкай ідэі (праблема свабоды, веры, бунту, пакутаў, кахання, маралі, каштоўнасцей, адзіноты, адчужанасці; роздум пра стан чалавека; "праклятыя праблемы" і інш.);
- слова як структурны элемент выяўлення свету (аналіз ролі слова ў пабудове выяўленчага свету твора; у пабудове атмасферы і настрою; у стварэнні характараў; у пабудове канфлікту; у фарміраванні пэўных адносін у чытача; у фарміраванні хранатопа твора (уплыў выбару слоў на час, месца, тэмп пабудовы апавядання));
- слова як выражэнне аўтарскіх адносін да пазатэкставай рэчаіснасці (адлюстраванне культурных, палітычных, сацыяльных поглядаў і інш.);
- слова як *семантычная* адзінка (носьбіт прамога і канататыўнага значэнняў; праблема полісеміі, гіпаніміі, сінаніміі, антаніміі і інш. у (не)літаратурных тэкстах); *сінтаксічная* (роля слова ў структуры сказа, слоў па-за структурай сказа), *прагматычная* (роля слова ў працэсе камунікацыі; праблематыка намераў адрасанта і чаканняў адрасата);
- моўныя гульні (граматычныя, семантычныя, фразеалагічныя) у (не)літаратурных тэкстах;
- моўная карціна свету ў (не)літаратурных тэкстах.

Мы таксама адкрытыя для іншых даследчых прапаноў.

АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ:

**Мовы канферэнцыі**: польская, беларуская, руская, украінская.
**Удзельнікі**: удзел у канферэнцыі могуць прыняць студэнты, аспіранты і навукоўцы, якія атрымалі вучоную ступень кандыдата навук не пазней за 5 гадоў з дня яе прысуджэння.
**Час выступлення**: 15 хвілін
**Фармат**: анлайн, на платформе MS Teams
**Тэрмін рэгістрацыі на канферэнцыю**: 28 лютага 2025 г.

Па выніках правядзення канферэнцыі плануецца выданне калектыўнай рэцэнзаванай манаграфіі.

**Крайні тэрмін падачы тэкстаў**: 22 чэрвеня 2025 года.

**Аплата**: удзел у канферэнцыі і публікацыя тэксту ў калектыўнай манаграфіі бясплатныя.

**Навуковы камітэт канферэнцыі**

Wawrzyniec Popiel-Machnicki (Adam Mickiewicz University, Poznań, Poland)
Dorota Pazio-Wlazłowska (Polish Academy of Sciences, Poland)
Karine Arustamyan (Vanadzor State University after Hovhannes Tumanyan, Armenia)
Ioannis Georgiadis (National and Kapodistrian Ioannis Georgiadis University of Athens, Greece)
Natallia Kabiak (University of Melbourne, Australia)
Alena Kalechyts (Constantine the Philosopher University in Nitra, Slovakia)
Irena Mikulaco (Juraj Dobrila University of Pula, Croatia)
Firengiz Paşayeva Yunus (Kafkas University, Kars, Turkey)

**Кантактныя асобы:**
dr Anna Humeniuk, ahume@amu.edu.pl
dr Olga Makarowska, olga.makarowska@amu.edu.pl
dr Weronika Terno-Jeleńska, weronika.jelenska@amu.edu.pl

*Будзем рады Вашаму ўдзелу у канферэнцыі!*